***Л.У.Ляховіч,** дацэнт*

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІН ГІСТАРЫЧНАГА ЦЫКЛА Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У ГАЛІНЕ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ І АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Дысцыпліны гістарычнага цыкла разам з музеязнаўчымі адыгрываюць вядучую ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, якія з'яўляюцца асабліва запатрабаванымі зараз, ва ўмовах развіцця суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і пазіцыяніравання яе гістарычнай і культурнай унікальнасці.

Гістарычныя дысцыпліны не толькі даюць базавыя веды і садзейнічаюць фарміраванню светапогляду. Артэфакты гісторыка-культурнай спадчыны набываюць свой сэнс якраз у кантэксце сваёй гістарычнай абумоўленасці. Патрэбна адзначыць, што ў нашай краіне большасць музеяў адносіцца да гістарычнага профілю. Таму спалучэнне гістарычных і музеязнаўчых дысцыплін у падрыхтоўцы спецыялістаў-музеязнаўцаў набывае асаблівы сэнс.

На кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства БДУ культуры і мастацтваў вядзецца выкладанне такіх дысцыплін, як гісторыя Беларусі (у тым ліку для студэнтаў усіх спецыяльнасцей універсітэта), гістарычнае краязнаўства, усеагульная гісторыя (старажытнасць, Сярэднявечча, Новы час і Найноўшы час), Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны (для студэнтаў усіх спецыяльнасцей), гісторыя і тэорыя гістарычнай навукі, крыніцазнаўства, археалогія, гісторыя матэрыяльнай культуры, гісторыя навукі і тэхнікі, гісторыя сацыякультурнай дзейнасці, гісторыя архітэктуры. Будучыя спецыялісты таксама вывучаюць архівазнаўства, геральдыку, сфрагістыку, нумізматыку, анамастыку. Кафедра можа прапанаваць такія курсы, як гісторыя Мінска, гісторыя дыпламатыі, гісторыя беларускага іканапісу, гісторыя нораваў і сямейна-шлюбных адносін і інш. (па выбары).

Выкладанне дадзеных дысцыплін метадычна забяспечана на кафедры: распрацаваны прадметна-метадычныя комплексы, выдадзены праграмы, прымяняюцца тэхнічныя сродкі навучання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўваюцца экскурсіі. Шэраг метадычных матэрыялаў кафедры размешчаны ў электроннай бібліятэцы ўніверсітэта.

Формы выкладання матэрыялу курсаў – лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі. Навучэнцы пішуць і абараняюць рэфераты. Асноўныя формы кантролю – экзамены і залікі. Увесь час вядзецца праца па ўдасканальванні тэматыкі семінарскіх заняткаў, а таксама матэрыялаў, якія прапануюцца для самастойнага вывучэння. На жаль, як і раней, вострай праблемай з'яўляецца кантроль за самастойнай работай студэнтаў, таму што ў вучэбным плане не прадугледжаны час на правядзенне такой формы работы.

Пералічаныя дысцыпліны належаць да гістарычнага цыкла, таму метадалагічнай асновай іх выкладання з'яўляецца спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў. Фармацыйны падыход з'яўляецца лінейнай інтэрпрэтацыяй гістарычнага працэсу і падзяляе яго на вядомыя прамежкі: першабытны, рабаўладальніцкі, феадальны, капіталістычны (ужываецца таксама тэрмін "індустрыяльны") і постіндустрыяльны (раней, у гістарычнай навуцы СССР, – сацыялістычны). Неабходна адзначыць, што дадзены падзел даволі спрошчаны. Каб гэтага пазбегнуць, фармацыйны падыход дапоўнены нелінейным – цывілізацыйным, у адпаведнасці з якім акцэнт робіцца на гістарычную і культурную ўнікальнасць канкрэтнай краіны, што дае прастору для гістарычнай інтэрпрэтацыі і дакладнасці [1, с. 44–57].

Выкладанне гістарычных дысцыплін падпарадкоўваецца таксама прынцыпам гістарычнага даследавання – гістарызму, сістэмнасці, аб'ектыўнасці [1, с. 193–208; 2, с. 142–159].

З дыдактычнага пункту гледжання гістарычныя дысцыпліны выкладаюцца адпаведна прынцыпам навуковасці, паслядоўнасці і сістэматычнасці, нагляднасці, даступнасці і ўліку ўзроставых асаблівасцей. У гэтым сэнсе патрэбна адзначыць паступовае выкладанне спачатку гісторыі Беларусі ў спалучэнні з сусветнай гісторыяй, потым на асноўныя веды па гісторыі надбудоўваюцца гісторыя матэрыяльнай культуры, гісторыя архітэктуры і дапаможныя гістарычныя дысцыпліны. Нарэшце, на чацвёртым курсе студэнты атрымліваюць веды па гісторыі і тэорыі гістарычнай навукі (гістарыяграфіі), засваенне якіх было б практычна немагчыма без ужо наяўных ведаў па гісторыі, філасофіі, культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гістарыяграфія дапаўняецца крыніцазнаўствам, засваенне якога таксама вядзецца на падрыхтаванай глебе.

Пры выкладанні гістарычных дысцыплін арганічна выкарыстоўваюцца веды па музеязнаўстве і ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, пры вывучэнні пэўных перыядаў сусветнай гісторыі звяртаецца ўвага на першыя перадмузейныя (у антычнай Грэцыі і антычным Рыме) і музейныя зборы (у перыяд Рэнесанса). Пры вывучэнні, напрыклад, Вялікай французскай рэвалюцыі студэнты даведваюцца, як Луўр з каралеўскага палаца зрабіўся нацыянальным музеем, а пры разглядзе паходаў Напалеона – пра вываз культурных каштоўнасцей напалеонаўскай арміяй з заваяваных тэрыторый і г.д. Пры выкладанні гістарыяграфіі абавязкова робіцца акцэнт на дзейнасці вучоных-"антыквараў", якія збіраюць і вывучаюць прадметы старажытнасці, на стварэнні цэлага шэрагу ўстаноў па захаванні і вывучэнні крыніц, распрацоўцы заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры. У працэсе вывучэння гісторыі Беларусі, гістарычнага краязнаўства, гісторыі матэрыяльнай культуры, археалогіі праблематыка музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны прасочваецца асабліва яскрава.

Прынцыпы даступнасці, а таксама паслядоўнасці і сістэматычнасці патрабуюць апоры на раней атрыманыя веды студэнтаў. Дадзены метад эфектыўны як на малодшых курсах (узгадваецца матэрыял, атрыманы ў школе), так і на старшых. У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра міжпрадметныя сувязі, якія не толькі "працуюць" на прыпамінанне, але і сістэматызуюць веды, дапамагаюць стварыць комплекснае ўяўленне па шэрагу сумесных дысцыплін, паказваюць адзінства навакольнага свету, неабходнасць комплекснага яго вывучэння. Патрэбна адзначыць, што выкарыстанне міжпрадметных сувязей цалкам адпавядае арыентацыі сучаснай навукі менавіта ў гэтым кірунку [1, с. 151–163].

Міжпрадметныя і міжкурсавыя сувязі, з'яўляючыся эфектыўным сродкам інтэнсіфікацыі навучання, не патрабуюць матэрыяльных ці арганізацыйных затрат. Выкарыстанне такіх сувязей дапамагае ўключыць айчынную гісторыю ў сусветны кантэкст, сінхранізацыі гістарычных падзей, параўнанню ступеней развіцця розных краін у канкрэтную эпоху. Практычна неабмежаваныя магчымасці дае зварот выкладчыка-гісторыка да філасофіі, культуралогіі, гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусветнай і айчыннай культуры, літаратуры, а таксама да выкарыстання актуальнай інфармацыі з грамадска-палітычнага і культурнага жыцця.

У дадзены момант на кафедры вядзецца праца па стварэнні ў пэўным сэнсе ўнікальнага вучэбнага дапаможніка "Гісторыя матэрыяльнай культуры", які інтэгруе веды па сусветнай гісторыі, айчыннай гісторыі, археалогіі, гісторыі паўсядзённасці. Дапаможнік будзе мець таксама распрацаваны вучэбна-метадычны апарат і будавацца на аснове сучаснай кагнітыўнай парадыгмы ў адукацыі.

Прадуктыўным у выкладанні з'яўляецца і праблемны падыход, для прымянення якога існуюць самыя шырокія магчымасці. Дастаткова ўзгадаць, напрыклад, дыскусійнасць шэрагу праблем, якія датычацца характару і стварэння Вялікага Княства Літоўскага, гісторыі Беларусі пачатку ХХ ст., гісторыі Савецкага Саюза. У сусветнай гісторыі неадназначна разглядаецца нават перыядызацыя шэрагу этапаў, пераасэнсоўваецца праблематыка Вялікай французскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, Другой сусветнай вайны, еўрапейскіх і расійскай манархій і г.д. Такое становішча цалкам зразумелае ва ўмовах сённяшняй метадалагічнай трансфармацыі ў гістарычнай навуцы, і вельмі важна навучыць студэнтаў не губляцца ў ім, лічыць яго нармальным, назапашваць веды, мець свой пункт гледжання, але ведаць і іншыя трактоўкі, а таксама паважаць пазіцыі іншых і валодаць культурай навуковай дыскусіі [3, с. 327–342].

Патрэбна адзначыць, што ўзгаданыя формы і метады працы на кафедры ўвесь час развіваюцца. На парадку дня з'яўляюцца такія маштабныя задачы, як увядзенне новай спецыялізацыі, распрацоўка новых прадметаў і курсаў, пашырэнне выкарыстання інавацыйных сродкаў выкладання. Узгаданыя меры прадыктаваныя асноўнай мэтай кафедры – удасканальваць працэс адукацыі ў адпаведнасці з сучасным узроўнем падрыхтоўкі спецыялістаў, які б адпавядаў сучасным крытэрыям і патрабаванням.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Методологические* проблемы истории: учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей, обеспечивающих получение высш. образования / В.Н.Сидорцов [и

др.]; под общ. ред. В.Н.Сидорцова. – Мн.: ТетраСистемс, 2006. – 352 с.

*2. Смоленский, И.И.* Теория и методология истории: учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / И.И.Смоленский. – М.: Академия, 2007. – 272 с.

*3. История* и философия отечественной исторической науки: учеб. пособие. – М.: РАГС, 2009. – 344 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ